*В.Я. БЕЗДЗЕЛЬ*

# ПАЛІТЫКА АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД У АДНОСІНАХ ДА ДЗЯЦЕЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1941–1944)

Рассматривается политика германизации детского населения на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны, которую проводили немецкие оккупационные власти. Раскрываются ее основные направления, практическая реализация, результаты.

The article is devoted to the policy of germanization pursued by the occupation authorities in relation to children population of the Belarusian territory during the Great Patriotic War. The main directions of this policy as well as its practical realization and results are revealed.

На Нюрнбергскім працэсе над галоўнымі нямецка-фашысцкімі злачынцамі было дадзена азначэнне такому паняццю, як «германізацыя» (анямечванне), што з'яўлялася часткай палітыкі, якую праводзілі немцы на захопленых тэрыторыях. Гэта «планы ассимилирования захваченных территорий экономически, политически и в культурном отношении, втягивания их в орбиту германской империи. Германизация, или онемечивание, означает уничтожение национального характера захваченных территорий и искоренение всех элементов, которые не примут нацистской идеологии»[1].

Калі разглядаецца гэтае пытанне, то часцей за ўсё звяртаюцца да плана «Ост» і дакументаў «Зялёнай папкі» (эканамічная эксплуатацыя захопленых тэрыторый). Але палітыка германізацыі па яе правядзенні на акупіраваных землях выходзіць далёка за рамкі гэтых дакументаў.

Трэба звярнуць увагу і на тое, як змянялася палітыка анямечвання ў залежнасці ад узросту тых, на каго яна была накіравана. Мы разгледзім германізацыю ў дачыненні да дзіцячага і маладзёжнага асяродка на тэрыторыі Беларусі.

На падставе аналізу дакументаў можна гаварыць аб тым, што акрэсленая палітыка прайшла некалькі этапаў у сваёй рэалізацыі.

**Першы этап.** Планы ў адносінах да захопу і валодання тэрыторыямі, што размяшчаліся на ўсход ад Польшчы, нацысцкае кіраўніцтва пачало

распрацоўваць адразу пасля пачатку Другой сусветнай вайны. Тэорыя «жыццёвай прасторы», неабходнай для нямецкага народа, расавая тэорыя заклалі падмурак для абгрунтавання планаў анямечвання на захопленых тэрыторыях. Ужо ў маі 1940 г. Гімлер заяўляў, што «процедуру германизации намечено провести путем отбора детей, которые должны отниматься у родителей, получать новое имя, посылаться в Германию и там ассимилироваться»[2].

Далейшыя распрацоўкі ў гэтым кірунку мелі ўжо і практычны характар, паколькі былі апрабаваны на насельніцтве Польшчы. Разам з тым у адносінах да ўсходніх славян гэтае пытанне карэкціравалася да самага пачатку вайны і непасрэдна ў яе ходзе.

Вынікам працы стаў дакумент «Некоторые соображения об обращении с лицами ненемецкой национальности на Востоке» Упраўлення расавай палітыкі, у якім прапаноўвалася абмежаваць тэрмін навучання дзяцей славян 4-ма класамі пачатковай школы. Мэта такой адукацыйнай і выхаваўчай палітыкі: «Распространить учение о том, что подчинение немцам, честность, прилежание и послушание являются божьей заповедью»[3].

Паралельна з планамі германізацыі распрацоўвалася агульная стратэгія паводзін нямецкіх войск на ўсходзе, якая была акрэслена Розенбергам за некалькі дзён да нападу на СССР: «Одной из главных целей вторжения является захват путем грабежа продовольствия и сырья, необходимых для немецкой военной машины, независимо от ужасных последствий, которые такой грабеж должен вызвать. Выполнение этих планов должно будет иметь своим результатом голодную смерть миллионов из-за отсутствия пищи»[4]. Вынікі гэтай дактрыны пасля пачатку вайны адчулі на сабе і дзеці, асабліва тыя, што не былі эвакуіраваны і засталіся ў дзіцячых дамах і піянерскіх лагерах.

Яшчэ да нападу на СССР кіраўніцтва нацысцкай Германіі мела шэраг планаў у адносінах да будучага палітычнага і тэрытарыяльнага ўладкавання саюзных рэспублік. Беларусь павінна была стаць састаўной часткай германскай імперыі. Насельніцтва планавалася метадычна вынішчаць, а найбольш прыгодных у расавых адносінах асіміляваць, у першую чаргу дзяцей і моладзь, паколькі можна было ўздзейнічаць на іх несфарміраваныя асобы (адсутнасць жыццёвага вопыту і падтрымкі дарослых).

Першыя месяцы вайны паказалі разыходжанні паміж тэорыяй і практыкай. Дзейнасць нямецкіх войскаў і загады кіраўніцтва былі накіраваны ў першую чаргу на масавае знішчэнне грамадзянскага насельніцтва. Пра гэта сведчаць і разважанні Гітлера наконт партызанскай барацьбы (ліпень 1941 г.), якая дае магчымасць знішчаць усё, што аказвае супраціўленне, і незадавальненне Гімлера колькасцю забітых мірных жыхароў (жнівень 1941 г.), што трэба дзейнічаць больш радыкальна.

Ніякай канкрэтнай праграмы, якая б уключала дзеянні па рэалізацыі планаў анямечвання на гэтым этапе, яшчэ няма, бо не створаны мясцовы апарат для рэалізацыі гэтых мэт. Але дзейнічае агульная стратэгія паводзін, што была зададзена Розенбергам. Так, напрыклад, у цяжкім становішчы апынуліся выхаванцы дзіцячых дамоў, якіх ніхто не збіраўся забяспечваць. М. Кузняцоў, які сустрэў вайну ў піянерскім лагеры, што хутка быў ператвораны ў дзіцячы дом, успамінаў: «Жизнь впроголодь уже с первых недель оккупации побуждала детей к поискам съестного на стороне»[5].

Германскія ўлады любымі шляхамі імкнуліся не дапусціць супраціўлення мясцовага насельніцтва, падазрона ставіліся нават да дзяцей. Камісар 254-й германскай дывізіі генерал-лейтэнант фон Бешніт загадваў бургамістрам «о появляющихся чужих лицах, в особенности детях, немедленно сообщать местному коменданту, немедленно расстреливать всякое лицо, подозреваемое в шпионаже» (2 снежня 1941 г.)[6].

Такім чынам, на першым этапе на акупіраваных тэрыторыях праводзілася палітыка фізічнага вынішчэння – як мага больш абмежаваць патрэбы мясцовага насельніцтва і штучна выклікаць высокую смяротнасць. Такая дзейнасць рэгулявалася асобнымі загадамі, накіраванымі на эксплуатацыю эканамічных і людскіх рэсурсаў Беларусі. Сітуацыя на франтах (часовыя поспехі, надзеі на бліцкрыг) давала магчымасць акупантам не задумвацца аб настроях мясцовага насельніцтва і ў якасці асноўнага сродку падпарадкавання выкарыстоўваць тэрор.

**Другі этап** (1942 г. – да перамогі савецкіх войск на Арлоўска-Курскай дузе). Канец 1941 – пачатак 1942 г. азнаменаваўся паражэннем фашыстаў пад Масквой і стратай надзей на бліцкрыг. Германскае кіраўніцтва вымушана было мабілізаваць новыя рэсурсы для таго, каб спыніць веснавое наступленне Чырвонай Арміі. Гэтыя акалічнасці абумовілі акупацыйную палітыку на землях Беларусі ў азначаны перыяд. Аналіз дакументаў дазваляе выдзеліць некалькі яе кірункаў:

1) ужо ў пачатку 1942 г. пачынаецца кампанія па вывазу рабочай сілы ў рэйх, спачатку добраахвотнаму, а потым прымусоваму;

2) палітыка вызначалася пэўным лавіраваннем у палітычнай і эканамічнай сферах (стварэнне калабарацыянісцкіх арганізацый, аграрная рэформа) і адначасова яшчэ большым уціскам у сувязі з нарастаючым партызанскім рухам.

Першыя дакументальныя сведчанні аб вывазе дзяцей у Германію адносяцца да лютага 1942 г. Менавіта пад гэтай датай вядомы ў беларускай гістарыяграфіі ліст мінскага гарадскога камісара В. Янэцке генеральнаму камісару В. Кубэ аб маладзёжнай палітыцы, у якім ён адзначае, што 42 чалавекі з 70 з дзіцячай калоніі ў Козырава «направлены в рейх как рабочая сила. В настоящее время принимаются усилия увеличить число направляемых в Германию детей»[7]. Хаця, як лічаць

аўтары даследавання «Белорусские остарбайтеры», праграмы па мэтанакіраванаму вывазу моладзі ў гэты час яшчэ няма.

Разам з тым такая палітыка ў 1942 г. закранула толькі падлеткаў ва ўзросце ад 15 гадоў (красавік 1942 г. – загад Заукеля, генеральнага ўпаўнаважанага па выкарыстанні рабочай сілы, аб неабходнасці мабілізацыі грамадзянскіх кваліфікаваных работнікаў і работніц ва ўзросце ад 15 гадоў для выкарыстання іх на працы ў Германіі; верасень 1942 г. – акцыя па вярбоўцы «ўсходніх работніц», дзяўчат і жанчын ад 15 да 35 гадоў).

Калі ў канцы 1942 г. стала зразумелым, што фактычна ўсе кампаніі па добраахвотным наборы рабочай сілы праваліліся, нямецкія ўлады зрабілі стаўку на моладзь, прымусовая мабілізацыя якой давала магчымасць выканаць устаноўленую квоту для Генеральнага камісарыята Беларусь (30 тыс. юнакоў і дзяўчат ва ўзросце 15–18 гадоў). У паведамленні Гімлеру ў канцы студзеня 1943 г. адзначалася, што «большинство молодой рабочей силы не только нигде и ничего не изучает и ничего продуктивного не производит, но и вовсе бездельничает», што «партизанские отряды систематически пополняются молодежью, поэтому необходимо по идейно-воспитательным причинам, а также в целях безопасности не оставлять в стране молодежь, прежде всего мужского пола»[8]. Праводзячы такую мабілізацыю, фашысты дасягалі некалькіх мэт адначасова: па-першае, падрывалі біялагічны патэнцыял беларускага народа і крыніцу папаўнення партызанскіх шэрагаў, па-другое, набіралі для сваёй эканомікі неабходную працоўную сілу, а па-трэцяе, у Германіі лягчэй было праводзіць палітыку анямечвання, адарваўшы моладзь ад сваякоў, і ад Радзімы. З гэтай мэтай у пачатку 1943 г. рэйхсфюрэр СС Гімлер выдаў загад, згодна якому на тэрыторыі Германіі ствараліся дзіцячыя лагеры, дзе ўтрымліваліся і праходзілі расавы адбор дзеці 1–10 і 10–16 гадоў.

У гэты час набірае моц і другі кірунак у палітыцы акупацыйных улад: працяг масавага тэрору, які накіраваны супраць усіх сацыяльных груп грамадства. Нечаканае супраціўленне вымушае актывізаваць барацьбу нават супраць дзяцей, жанчын і старых. Вядомы загад «Аб барацьбе з бандамі» (ад 16.12.1942 г.) дазваляў і абавязваў «применять любые средства, без ограничения, также против женщин и детей, если это только способствует успеху»[9]; у дырэктыве кіраўніка аператыўнага штаба паліцыі бяспекі і СД у Мінску штандартэнфюрэра СС Піфрадэра (ад 18.11.1942 г.) патрабавалася, каб спальванне вёсак абавязкова суправаджалася пагалоўным знішчэннем усіх жыхароў, паколькі «опыт учит, что коллективные расстрелы, сожжения деревень без полной ликвидации или выселения их жителей приводят лишь к отрицательным для нас последствиям»[10].

Але ўжо ў канцы 1942 г. афіцэрам СД, што дзейнічалі ў тылавых раёнах германскай арміі, загадана больш не расстрэльваць дзяцей, «самое важное теперь – набор рабочих»[11]. Задача захопу дзяцей і падлеткаў заключалася не толькі ў тым, каб выкарыстаць іх на прадпрыемствах Германіі, але і ў тым, каб шляхам першаснай селекцыі адабраць найбольш прыгодныя ў расавых адносінах тыпы і асіміляваць іх. Для гэтага ствараліся перасыльныя або зборныя лагеры, з якіх насельніцтва, што прайшло адбор, адпраўлялі ў Германію.

Свае інтарэсы да дзяцей былі і ў разведслужбаў. З ліку захопленых падчас карных экспедыцый, з ліку дзетдомаўцаў адбіраліся вучні для адпаведных школ. У пачатку 1942 г. існавала цэлая сетка такіх разведшкол, у якія немцы набіралі дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў[12]. У асноўным гэта былі тыя, чыіх бацькоў рэпрэсіравалі, беспрытульныя, асацыяльныя дзеці. Так, у верасні 1943 г. з розных дзіцячых дамоў г. Оршы было адабрана немцамі да 70 падлеткаў ва ўзросце ад 11 да 13 гадоў, якіх потым вывезлі ў Германію для навучання ў спецыяльнай школе. Пасля заканчэння тэрміну вучобы дзяцей накіроўвалі за лінію фронту для збору дадзеных. Многія адразу ж здаваліся прадстаўнікам савецкай улады. Для падлеткаў гэта быў адзіны шанц трапіць да «сваіх», і такіх было большасць.

Існаванне шырокай сеткі разведшкол на акупіраваных тэрыторыях не толькі Беларусі, але Расіі і Украіны абумоўлена, на наш погляд, масавым беспрытульніцтвам і збядненнем насельніцтва гэтых тэрыторый. Дзеці, што страцілі бацькоў, у большасці выпадкаў не мелі сродкаў існавання, не было тых, хто змог бы абараніць іх. Разам з тым трэба адзначыць, што разведработу немцы праводзілі дастаткова актыўна, і гэта дастаўляла савецкім войскам пэўныя праблемы.

Сферай непасрэднай рэалізацыі планаў германізацыі дзяцей і моладзі заставалася школа. Менавіта адукацыя павінна была стаць праваднікам ідэй нацыянал-сацыялізму і садзейнічаць падрастаючаму пакаленню ў пазбаўленні ад уплыву камуністычнай ідэалогіі. У «Часовым школьным парадку» падкрэслівалася, што асноўнай мэтай новай адукацыйнай палітыкі з'яўляецца выхаванне падрастаючай моладзі Беларусі строга ў духу новай Еўропы пад кіраўніцтвам А. Гітлера[13]. На акупіраваных тэрыторыях улады спрабавалі стварыць новую сістэму адукацыі. Дзеці ва ўзросце ад 8 да 15 гадоў былі абавязаны наведваць заняткі. Для тых, хто не падпарадкоўваўся, прымяняліся розныя санкцыі: ад накладання штрафаў на бацькоў да пазбаўлення хлебных картак (у адносінах да дзяцей 14- і 15-гадовага ўзросту)[14].

Але на працягу 1941–1944 гг. даваенная колькасць школ так і не была адноўлена па розных прычынах: памяшканні былі заняты нямецкімі войскамі, не наведвалі дзеці, не хапала настаўнікаў, матэрыяльных сродкаў. Гэта ўплывала і на настроі сярод моладзі, на яе заняткі. Так, напрыклад, у чэрвені 1942 г. Магілёўскі аддзел адукацыі адзначаў, што «в связи с закрытием большин-

ства школ значительная часть молодежи предоставлена самой себе. Это усиливает влияние на нее уличного элемента, что сказывается в многочисленных случаях воровства, хулиганства и т. д. Не исключена возможность влияния на молодежь и чуждого элемента»[15].

Такім чынам, мы бачым, што палітыка акупантаў супярэчлівая. З аднаго боку, яны імкнуліся падавіць супраціўленне, партызанскі рух, з другога – унутраныя рэсурсы Германіі не маглі ў поўнай меры забяспечыць патрэбы ваеннага часу і ўзнікла неабходнасць у рабочай сіле. Паколькі колькасць дабравольцаў была недастатковай, то нямецкія ўлады перайшлі да прымусовай працоўнай мабілізацыі. Грамадзянскае насельніцтва, у тым ліку дзеці і моладзь, цярпелі як у першым, так і другім выпадку. Мерапрыемствы, што праводзіліся з мэтай укараніць новую ідэалогію, не ахоплівалі ўсё дзіцячае насельніцтва, а таму не мелі таго эфекту, на які разлічвалі фашысты.

**Трэці этап** (пасля перамогі савецкіх войск на Арлоўска-Курскай дузе да поўнага вызвалення тэрыторыі Беларусі ў жніўні 1944 г.). Палітыка акупацыйных улад была накіравана на спустошэнне захопленых тэрыторый (адпаведны загад Гімлера ад 10.07.1943 г.). Грамадзянскае насельніцтва тэрмінова падлягала эвакуацыі. Вызваленыя тэрыторыі планавалася выкарыстаць у сельскагаспадарчых мэтах, а «детские лагеря расположить на границе этих территорий, так, чтобы дети могли быть использованы в качестве рабочей силы»[16]. Усе тыя, хто не меў бацькоў, накіроўваліся ў зборныя лагеры, асноўная мэта якіх – адбор і вываз у Германію.

Такія дзеянні адпавядалі абвешчанай яшчэ ў верасні 1942 г., а потым у канцы 1943 г. Гімлерам праграме асіміляцыі славянскіх дзяцей: «Нашим долгом будет взять себе их детей для того, чтобы убрать их из нежелательного окружения и, если будет необходимо, даже просто выкрадывать или отнимать детей насильно. Или мы приобретем хорошую кровь, которую мы сумеем использовать и дадим ей место среди нашего народа, или мы уничтожим эту кровь. …Мы будем воспитывать их детей так, как мы хотим сами»[17]. Выхаванне ў нацыянал-сацыялістычным духу праводзілася на акупіраваных землях праз дзіцячыя садкі, школы, дамы і праз мерапрыемствы па вывазу дзяцей у канцлагеры за межы Беларусі, дзе сістэма перавыхавання была больш жорсткай.

У 1944 г. выразна акрэслілася дэмаграфічная праблема Германіі, таму ўзроставы цэнз на вываз дзяцей быў зніжаны з 14–15 гадоў да 10. Летам 1944 г. групай армій «Цэнтр» была праведзена аперацыя «Сено». Яе задачай было захапіць 40–50 тыс. падлеткаў ва ўзросце ад 10 да 14 гадоў і адправіць іх у Германію. У будучым іх планавалася выкарыстаць на акупіраваных тэрыторыях як апору для далейшай германізацыі.

Надзейнай крыніцай для папаўнення рабочай сілай на працягу ўсёй вайны заставаліся дзіцячыя дамы. Толькі ў чэрвені 1944 г. у сувязі з правядзеннем аперацыі «Сено» з Беларусі былі вывезены 82 выхаванцы з Брэсцкага дзіцячага дома, 216 – з Дзятлаўскага і Краснасельскага прытулкаў (30 з іх памерлі ў дарозе)[18], 14 – з Горацкага дзетдома[19]. Акрамя гэтага, на акупіраванай тэрыторыі Беларусі існаваў шэраг такіх дамоў, у якіх збіралі дзяцей спецыяльна для адпраўкі ў Германію: у в. Загародскі Пагост Пінскага раёна, у в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна, у г. п. Петрыкаў, донарскі лагер на тэрыторыі вучэбнай гаспадаркі «Чырвоны бераг» Жлобінскага раёна (вывезена 1990 дзяцей), і гэта далёка не поўны пералік такіх дамоў і лагераў.

Такім чынам, пасля шэрагу паражэнняў на франтах палітыка акупацыйных улад становіцца больш жорсткай. Павялічваецца колькасць вывезеных на прымусовыя работы, у тым ліку і дзяцей. Мэта такой палітыкі – не дапусціць ваеннага ўзмацнення саперніка, падарваць біялагічны патэнцыял народа, выкарыстаць дзіцячую працу на прадпрыемствах Германіі.

Пасля выгнання акупантаў з тэрыторыі Беларусі было падлічана, што ў Германію гвалтоўна вывезлі 33 244 дзіцяці да 16 гадоў, вярнулася на Радзіму толькі 22 825 чал.[20] Непасрэдна на акупіраваных беларускіх землях было расстраляна, павешана і спалена 166 885 дзяцей[21]. Гэтыя страты – вынік мэтанакіраванай палітыкі анямечвання і вынішчэння на беларускіх землях, якая знайшла сваё ўвасабленне ў стварэнні спецыяльных дзіцячых калоній, рабаўніцтве дзіцячых дамоў, прымусовых працоўных мабілізацыях, забойстве ўсіх тых, хто мог аказаць супраціўленне. Калі акупацыйныя ўлады ў 1942–1943 гг. яшчэ спрабавалі лавіраваць і ўлічваць настрой мясцовых жыхароў, то пасля імклівага наступлення Чырвонай Арміі ў сярэдзіне 1943 г. перайшлі да палітыкі масавага вынішчэння і «выпаленай зямлі».

На працягу ўсяго ваеннага перыяду дзіцячае насельніцтва цікавіла фашыстаў у якасці донараў, як танная рабочая сіла, як будучая прыслуга ў «новай Еўропе». Мерапрыемствы, што праводзіліся для дасягнення гэтых мэт, былі накіраваны на перавыхаванне дзяцей, на вынішчэнне гістарычнай памяці і поўнае падпарадкаванне нацысцкай Германіі.

[1] Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками: Сб. материалов: В 7 т. / Под общ. ред. Р.А. Руденко. М., 1959. Т. 4. С. 557.

[2] Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: В 3 т. Мн., 1983. Т. 1. С. 167.

[3] СС в действии: Документы о преступлениях СС / Под ред. и с предисловием М.Ю. Рагинского. М., 1969. С. 503–505.

[4] Нюрнбергский процесс…

[5] Кузнецов М. Это тоже наша история. Национал-социализм глазами малолетнего узника. Исповедь о пережитом. Могилев, 2004. С. 86.

[6] Гл.: Нюрнбергский процесс… С. 250.

[7] Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944):

Документы и материалы: В 2 кн. / Сост. Г.Д. Кнатько и др. Мн., 1996. Кн. 1. С. 57.

[8] Там жа. С. 229.

[9] Нюрнбергский процесс… С. 347.

[10] Нацистская политика геноцида и «выжженной земли» в Белоруссии (1941–1944). Мн., 1984. С. 41.

[11] СС в действии… С. 382.

[12] Гл.: При попытке ребят отказаться немецкие офицеры угрожали расстрелом // Исторический архив. 2005. № 2. С. 166.

[13] Гл.: Жылінскі М.Г. Адукацыя на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.): Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мн., 2002. С. 10.

[14] Гл.: Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 260. Воп. 1. Спр. 15. Арк. 169.

[15] Там жа. Спр. 45. Арк. 56.

[16] СС в действии… С. 499.

[17] Нюрнбергский процесс… С. 564.

[18] Гл.: Паўлаў У.П. Дзеці ліхалецця: Дакумент. нарысы. Мн., 2005. С. 407–408.

[19] Гл.: Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 2074. Воп. 3. Спр. 69. Арк. 10.

[20] Гл.: Кузнецов М. Указ. тв. С. 347.

[21] Гл.: Жылінскі М.Г. Указ. тв. С. 17.

Паступіў у рэдакцыю 19.09.07.

***Вераніка Яўгенаўна Бездзель*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар У.К. Коршук.